2. Национальная комиссия ценных бумаг и фондового рынка Украины [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.nssmc.gov.ua/reiestr-nederzhavnykh-pensiinykh-fondiv/. – Дата доступа: 15.10.2022.

3. О государственной пенсионной системе: Закон Респ. Молдова от 17 дек. 1998 г. № 156 // Национальная касса социального страхования Республики Молдова [Электронный ресурс]: https://www.legis.md/cautare/getResults?doc_id=125810&lang=ru. – Дата доступа: 21.03.2022.

4. Пенсионная система в России [Электронный ресурс] // Единый накопительный пенсионный фонд Российской Федерации. – Режим доступа: https://www.enpf.kz/ru/pension-system/world/russia.php. – Дата доступа: 15.10.2022.

5. Показатели фонда [Электронный ресурс] // Единый накопительный пенсионный фонд Республики Казахстан. – Режим доступа: https://www.enpf.kz/ru/indicators/pa/current.php. – Дата доступа: 15.10.2022.

6. Тамазян, К. Р. Накопительная пенсионная система Армении: история становления / К. Р. Тамазян, А. Е. Джангирян // Финансовый журнал. – 2018. – № 4. – С. 53–61.

7. Трехуровневая пенсионная система [Электронный ресурс] // Pravo.ua. – Режим доступа: https://pravo.ua/articles/trehurovnevaja-pensionnaja-sistema. – Дата доступа: 15.10.2022.

***А.У. Кімбар**, магістр гістарычных навук*
*МГПК (Мінск)*

## АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ЛКСМБ ЯК МАДЭЛЬ ДЛЯ АФАРМЛЕННЯ МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гісторыя беларускага маладзёжнага руху бярэ пачатак у другой палове XIX ст. Дадзены рух быў прадстаўлены дзейнасцю шэрагу арганізацый, у якія ўваходзілі прадстаўнікі рабочай, сялянскай, студэнцкай моладзі і навучэнцы. Гэта былі і народніцкія гурткі, і арганізацыі моладзі пры палітычных партыях, культурніцкія гурткі і інш. Пасля прыходу да ўлады партыі бальшавікоў і з афармленнем савецкай грамадска-палітычнай сістэмы вядучай маладзёжнай арганізацыяй становіцца Камуністычны саюз моладзі (камсамол). На тэрыторыі Беларусі з 1920 г. дзейнічаў Камуністычны саюз моладзі Беларусі (далей – КСМБ), які ў 1924 г. быў перайменаваны ў Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі (далей – ЛКСМБ) [4, с. 134].

Паступова камсамол становіцца адзінай маладзёжнай грамадска-палітычнай арганізацыяй у рэспубліцы. Адхілялася ўсялякая мэтазгоднасць стварэння маладзёжных рухаў па-за межамі камсамола. Так, у рашэннях VI з'езда

Расійскага камуністычнага саюза моладзі (далей – РКСМ), у які арганізацыйна ўваходзіў КСМБ / ЛКСМБ, падкрэслівалася, што камсамол павінен стаць «школай ваяўнічага бальшавізму ... не дапускаць у маладзёжных рухах ніякіх апартуністычных плыняў, бязлітасна змагацца з імі» [3, с. 8].

З 1991 г. у Рэспубліцы Беларусь ствараецца ўласная грамадска-палітычная сістэма, актыўна фарміруецца грамадзянская супольнасць. Неад’емнай часткай гэтых працэсаў становіцца афармленне маладзёжнага руху. Самымі буйнымі па колькасці членаў сярод усіх маладзёжных арганізацый з’яўляліся Беларускі саюз моладзі (далей – БСМ) і Беларускі патрыятычны саюз моладзі (далей – БПСМ), якія аб’ядналіся ў 2002 г. у Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ).

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца аналіз уплыву ЛКСМБ на працэс арганізацыі дзейнасці маладзёжных арганізацый Рэспублікі Беларусь у 1990-я – пачатку 2000-х гг. У якасці асноўных крыніц даследавання выступае статутная і праграмная дакументацыя маладзёжных арганізацый.

Спачатку разгледзім арганізацыйную структуру і асноўныя мэты і задачы дзейнасці беларускага камсамола.

У першыя гады існавання КСМБ карыстаўся праграмнай дакументацыяй РКСМ [10, с. 2]. Паводле статута, зацверджанага ІІІ Усерасійскім з’ездам РКСМ, вызначалася, што РКСМ будуецца на асновах дэмакратычнага цэнтралізму па тэрытарыяльнай прыкмеце. Вышэйшым кіруючым органам кожнай арганізацыі з’яўляўся агульны сход ці канферэнцыя, якая абірае камітэт, які, у сваю чаргу, з’яўляецца іх выканаўчым органам і кіруе работай у прамежках паміж імі [10, с. 4–5]. Членам РКСМ мог быць кожны чалавек ва ўзросце ад 14 да 23 год, які прызнае праграму і статут саюза, актыўна ўдзельнічае ў адной з арганізацый і аплачвае членскія ўнёскі [10, с. 3].

Арганізацыйная структура КСМБ / ЛКСМБ у далейшыя гады перацярпела шэраг дробных змен і ўдакладненняў. Так, у 1930-я гг. было дададзена, што арганізацыя будуецца не толькі на асновах дэмакратычнага цэнтралізму і па тэрытарыяльнай прыкмеце, але і па вытворчай прыкмеце. Таксама дадавалася, што вышэйшым кіруючым органам у кожнай арганізацыі нароўні з агульным сходам і канферэнцыяй можа выступаць з’езд [6, с. 21]. Ва ўстаноўчых дакументах падкрэслівалася, што камсамол з’яўляецца рэзервам і адданым памочнікам камуністычнай партыі [6, с. 3–4]. Паступова за з’ездам замацоўваецца роля вышэйшага органа кіравання.

Змяняецца ўзроставая структура членаў арганізацый і далейшае знаходжанне на ўліку. Калі ў 1920–1930 гг. членам камсамола мог быць кожны чалавек ва ўзросце ад 14 да 23 год, які прызнае праграму і статут саюза, актыўна ўдзельнічае ў адной з арганізацый і аплачвае членскія ўнёскі, а па дасягненні 23 год ён мог заставацца пасіўным членам (з правам дарадчага голасу, альбо

з правам рашаючага, калі абраны на кіруючую пасаду) [10, с. 3], то ў пасляваенны час у арганізацыю прымаліся юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 28 год, а тыя члены, што дасягнулі 28-гадовага ўзросту і не былі выбраны ў кіруючыя камсамольскія органы, здымаліся з уліку і выбывалі з ЛКСМБ [7, с. 9].

У 1990 г. праходзіць XXIX з'езд ЛКСМБ, на якім у якасці праграмных мэт арганізацыі вызначаюцца выражэнне і абарона інтарэсаў моладзі, актыўны ўплыў на распрацоўку і ўдзел у стварэнні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, накіраваны на прагрэс у Беларусі і стварэнне ў рэспубліцы гуманнага дэмакратычнага грамадства [5, с. 2–3].

У 1990-я гады з распадам СССР назіраюцца карэнныя змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Закладваецца пачатак фарміравання шматпартыйнасці, шэрагу новых грамадскіх арганізацый. На гэтыя працэсы істотны адбітак наклала савецкая грамадска-палітычная сістэма. Так, у снежні 1991 г. на XXX з'ездзе ЛКСМБ прымаецца рашэнне аб зменах у арганізацыі і перайменаванні яе ў Союз моладзі Беларусі. Дадзеная арганізацыя з'яўлялася правапераемнікам камсамола Беларусі і нават працягвала весці нумарацыю сваіх з'ездаў услед за з'ездамі ЛКСМБ [1, с. 24].

У сакавіку 1995 г. на XXXII з'ездзе Саюза моладзі Беларусі прымаецца рашэнне пра змену назвы арганізацыі на Беларускі Саюз моладзі. Прымаецца статут арганізацыі, паводле якога асноўнай мэтай дзейнасці з'яўляецца стварэнне ўмоў для свабоднага развіцця чалавека, раскрыцця яго творчага патэнцыялу, абарона і рэалізацыя інтарэсаў і правоў членаў арганізацыі, маладых людзей Рэспублікі Беларусь, садзейнічанне стварэнню гуманнага дэмакратычнага грамадства [9, с. 3]. Членам дадзенага аб'яднання мог стаць любы грамадзянін Беларусі ва ўзросце ад 14 да 30 год [9, с. 6].

Арганізацыйная будова БСМ асноўвалася на пярвічных, раённых і гарадскіх арганізацыях, якія мелі права аб'ядноўвацца ў тэрытарыяльныя і абласныя арганізацыі [9, с. 9–10]. Вышэйшым органам БСМ з'яўляўся з'езд, які мусіў праводзіцца не радзей за адзін раз на тры гады і на якім вызначаўся ЦК БСМ [9, с. 11–12]. Фактычна, арганізацыйная структура БСМ паўтарала арганізацыйную структуру ЛКСМБ.

У статуце арганізацыі адзначалася, што БСМ з'яўляецца незалежным ад палітычных партый, дзяржаўных, гаспадарчых і адміністрацыйных органаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў [9, с. 2]. Гэта палажэнне задавальняла не ўсіх членаў арганізацыі.

У маі 1997 г. быў створаны Беларускі патрыятычны саюз моладзі. У статуце БПСМ, як і ў статуце БСМ, указвалася на самастойнасць і добраахвотнасць дадзенай грамадскай арганізацыі, статус рэспубліканскага грамадскага аб'яднання [8, с. 1]. Дадзеная арганізацыя ставіла асноўнай мэтай сваёй дзейнасці аб'яднанне патрыятычна настроенай моладзі для абароны сваіх правоў

і законных інтарэсаў, для актыўнага ўдзелу ў пабудове грамадства сацыяльнай справядлівасці і прагрэсу, фарміраванне ў маладзёжным асяродку светапогляду, які заснаваны на хрысціянскіх духоўна-маральных каштоўнасцях [8, с. 4–5]. Пры гэтым, неабходна адзначыць, што асноўныя задачы і метады дзейнасці БПСМ у цэлым супадалі з задачамі і метадамі дзейнасці БСМ.

Членам БПСМ мог стаць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, а таксама асоба без грамадзянства, якая пастаянна пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад 14 да 35 год [8, с. 8–9].

Асновай БПСМ выступалі пярвічныя арганізацыі, якія маглі аб'ядноўвацца ў раённыя, гарадскія арганізацыі, якія, у сваю чаргу, стваралі абласныя (Мінска) арганізацыі для каардынацыі дзейнасці і ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі і грамадскімі аб'яднаннямі [8, с. 12].

Вышэйшым органам БПСМ з'яўляўся з'езд, які, як і з'езд БСМ, мусіў праводзіцца не радзей за адзін раз на тры гады і на якім вызначаўся ЦК БПСМ [8, с. 14–15].

Такім чынам, у рэспубліцы з 1997 г. існавалі два саюза моладзі, якія мелі падобныя мэты, задачы і арганізацыйную структуру. Як адзначаюць А.Г. Слука і Д.К. Безнюк, «постепенно становилось очевидно, что две крупнейшие молодежные организации страны – БПСМ и БСМ – фактически идут параллельными курсами» [2, с. 244].

У верасні 2002 г. у Мінску прайшлі з'езды БПСМ і БСМ, на якіх было прынята рашэнне пра аб'яднанне ў БРСМ. У статуце дадзенага грамадскага аб'яднання адзначаецца, што БРСМ з'яўляецца правапераемнікам БПСМ, БСМ і ЛКСМБ [11, с. 3]. Мэтай дзейнасці з'яўляецца стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі, раскрыцця яе творчага патэнцыялу, садзейнічанне развіццю ў Рэспубліцы Беларусь грамадзянскай супольнасці, заснаванай на патрыятычных і духоўна-маральных каштоўнасцях беларускага народа [11, с. 6]. Членамі БРСМ могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь і асобы без грамадзянства, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўзросце ад 14 да 31 года, прычым членства можа быць падоўжана пасля дасягнення 31 года [11, с. 10].

Арганізацыйнай асновай БРСМ выступаюць пярвічныя арганізацыі, якія ствараюцца па месцы працы, вучобы, жыхарства і могуць аб'ядноўвацца ў тэрытарыяльныя (раённыя, гарадскія, якія ўтвараюць абласныя (Мінскую гарадскую) арганізацыі [11, с. 14]. Вышэйшым органам пярвічнай арганізацыі з'яўляецца агульны сход членаў, тэрытарыяльнай арганізацыі – канферэнцыя, а вышэйшым органам БРСМ – з'езд, які праводзіцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз на тры гады і абірае ЦК БРСМ і Цэнтральную кантрольную камісію. Нумарацыя з'ездаў працягвае традыцыю з'ездаў ЛКСМБ і СМБ / БСМ. Так, з'езд, на якім быў зацверджаны статут БРСМ, лічыцца XXXVIII з'ездам [11, с. 19–20].

Такім чынам, больш чым сямідзесяцігадовая гісторыя дзейнасці КСМБ / ЛКСМБ пакінула значны адбітак на развіцці маладзёжнага руху ў Рэспубліцы Беларусь. Арганізацыйная структура ЛКСМБ, якая канчаткова сфарміравалася ў другой палове XX ст., стала асновай для афармлення маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў у 1990-я гг. і выкарыстоўваецца грамадскім аб'яднаннем «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

### Спіс крыніц


1. ВЛКСМ – БРСМ: путь длинной в 90 лет / Администрация Фрунзенского района. – Минск : [б. и.], 2008. – 27 с.
2. В ритме летящих лет...: очерки истории комсомола Беларуси: ВЛКСМ – ЛКСМБ – 100 / В. Ф. Гигин [и др. ] – Минск : Звязда, 2018. – 277 с.
3. Мядзянік, У. І. Маладзёжны рух у Беларусі (1918-1930) / У. І. Мядзянік, А. Б. Жайваронак, Л. М. Гайдукевіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1992. – № 2. – С. 6–8.
4. Очерки истории Ленинского комсомола Белорусии / Институтт истории партии при ЦК КПБ – филиал институтата марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск : Беларусь, 1975. – 534 с.
5. Программные цели и основные направления деятельности, Устав ЛКСМБ Белоруссии / XXIX съезд Ленинского коммунистического Союза Молодежи Белоруссии. – Минск, 1990. – 16 с.
6. Статут Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, Партмассектар, 1933. – 55 с.
7. Статут Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, Рэдакцыя масава-палітычнай літаратуры, 1962. – 27 с.
8. Устав Белорусского патриотического союза молодежи. – [Б. м.], 1997. – 22 с.
9. Устав Белорусского Союза молодежи. – Минск, 1995. – 20 с.
10. Устав Коммунистического союза молодежи Белоруссии. – Минск : Государственное издательство ССР Белоруссии, 1921 г. – 15 с.
11. Устав Общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи». – Минск, 2005. – 31 с.